**ПО́ЛАЦКАЯ РА́ТУША**, помнік археалогіі ў г. Полацк. Паводле прывілея 1498 гораду на магдэбургскае права палачанам было загадана пабудаваць ратушу «на местцы годном». П.р. была ўзведзена пасля 1509. Праіснавала да 2-й пал. 18 ст. У 1780 на яе месцы ўзведзены дом генерал-губернатара. У 1996, пад час археал. нагляду за будаўніцтвам на яго тэр., П.А.Русаў зафіксаваў падмуркі 3 розначасовых мураваных будынкаў, зробленыя ў тэхніцы рэнесансавай муроўкі. На Пд ад П.р. размяшчаўся гар. рынак, на Пн – вул. Вазнясенская, з У пралягала вул. Прабойная. Каля П.р. быў гасціны двор. Крыніцай для рэканструкцыі знешняга выгляду ратушы з'яўляецца абраз св. Мікалая з фондаў Нац. Полацкага гісторыка-культ. музея-запаведніка. Выява святога змешчана на фоне горада з выразнай барочнай забудовай 18 ст. Злева ад фігуры – высокая шмат'ярусная званіца, за фігурай святога – грамадзянская забудова, справа – будынак, які нагадвае ратушу. Гэтыя пабудовы могуць быць суаднесены з Полацкім *Сафійскім саборам*, *Полацкім езуіцкім калегіумам* і П.р. На малюнку ратуша размешчана за сцяной рынку.

*Літ.*: Дук Дз.У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. Наваполацк, 2007; Яго ж. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.). Наваполацк, 2010. *Дз.У.Дук.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова